ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
27 красавіка 2021 г. № 253

# Аб узнагароджанні Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Узнагародзіць Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь за:

высокую якасць у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў, развіццё навуковай і інавацыйнай дзейнасці, значны ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы аграпрамысловай вытворчасці ўстанову адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»;

шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у добраўпарадкаванне тэрыторыі г. Мінска Гамлякова Аляксандра Уладзіміравіча, галоўнага інжынера вытворчага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Зелянбуд Маскоўскага раёна г. Мінска»;

шматгадовую плённую працу ў сістэме адукацыі, высокія дасягненні ў прафесійнай дзейнасці Дармешкіну Святлану Аляксандраўну, намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення эканомікі адукацыі – начальніка ўпраўлення планавання і фінансавання бюджэтных расходаў Міністэрства адукацыі;

шматгадовую плённую навукова-арганізацыйную дзейнасць, распрацоўку і ўкараненне ў вытворчасць новых сучасных тэхналогій Ільюшчанку Аляксандра Федаравіча, генеральнага дырэктара дзяржаўнага навукова-вытворчага аб’яднання парашковай металургіі – дырэктара дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут парашковай металургіі імя акадэміка А.У.Романа»;

шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у ажыццяўленне дзяржаўнай палітыкі ў аграпрамысловым комплексе Карбановіч Таццяну Міхайлаўну, намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства – начальніка ўпраўлення бульбаводства, плодаагародніцтва, аграхіміі і аховы раслін Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання;

шматгадовую плённую працу ў органах дзяржаўнага кіравання, высокі прафесіяналізм, узорнае выкананне службовых абавязкаў Кунцэвіч Алену Канстанцінаўну, першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы Мінскага аблвыканкама;

шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у аказанне высокакваліфікаванай медыцынскай дапамогі Марчанку Васілія Пракопавіча, урача-кардыёлага кардыялагічнага аддзялення № 1 установы аховы здароўя «4-я гарадская клінічная бальніца імя М.Я.Саўчанкі».

**Прэм’ер-міністр Рэспублікі Беларусь** **Р.Галоўчэнка**